Усходні гараскоп на наступны тыдзень

АВЕН. На гэтым тыдні не варта прыспешваць падзеі, і тады яны ў падзяку за ваша доўгае цярпенне пацешаць вас. У аўторак блізкія людзі будуць мець патрэбу ў падтрымцы, выслухайце іх і дайце каштоўную параду, але не спрабуйце вырашыць усе праблемы за іх. У сераду і чацвер важна засяродзіцца на працы.

ЦЯЛЕЦ. Адчуванне напружанасці паступова пачынае знікаць, становіцца лягчэй і прасцей, але гэта не значыць, што час расслабляцца. Паспрабуйце быць настойлівымі і патрабавальнымі, адстойвайце свой пункт гледжання, але не правакуйце канфліктных сітуацый. Не варта ператвараць подых ветрыка ва ўраган.

БЛІЗНЯТЫ. Пазітыўны погляд на жыццё адкрые перад вамі новыя магчымасці. Арыгінальныя ідэі ў дзелавой сферы прынясуць вам поспех і прыбытак. Рызыкуйце, ажыццяўляйце свае планы, прымайце нестандартныя рашэнні. У вас усё атрымаецца. Зоркі таксама прадракаюць вам асабістае жыццё з яркімі ўражаннямі, пяшчоту і запал.

РАК. На гэтым тыдні надыходзіць спрыяльны момант для абнаўлення ў многіх жыццёвых сферах. Зрэшты, будаваць грандыёзных планаў не варта, лепш заняцца паўсядзённымі справамі. У чацвер і пятніцу ўдасца прадэманстраваць высокі прафесіяналізм і сваю незаменнасць у працы, што можа абярнуцца для вас прыемнай узнагародай.

ЛЕЎ. У вас з'явіцца нямала спосабаў атрымаць жаданае, было б што жадаць. А вось апатыя і лянота — гэта шлях у нікуды. Поспеху можна будзе дамагчыся выключна сваёй працай. У аўторак непажадана распачынаць сваркі і канфлікты, у гэты дзень лепш мірыцца з выпадамі нядобразычліўцаў. У нядзелю пажадана адпачыць далей ад дома, варта змяніць абстаноўку.

ДЗЕВЫ. Неабходна быць больш уважлівымі да блізкіх людзей. Вашы крытычныя заўвагі могуць іх пакрыўдзіць, і гэта пагражае сур'ёзнай сваркай. У сераду не ўвязвайцеся ні ў якія, нават бяскрыўдныя, авантуры. Магчыма з'яўленне новых ідэй, аднак не ўсе яны будуць рэалістычнымі. Найбольш спрыяльны для вас дзень — пятніца.

**ШАЛІ*. Пачатак тыдня пажадана прысвяціць вырашэнню старых праблем. Далей іх адкладаць нельга. Вы зможаце аднавіць ранейшыя сяброўскія адносіны з большасцю партнёраў і аднадумцаў. Тыя прапановы, што паступаюць да вас, акажуцца досыць цікавымі, а кантракты — выгаднымі. У чацвер магчымы прафесійныя інтрыгі і зайздрасць з боку калег.

**СКАРПІЁН*. На гэтым тыдні Сіняя птушка можа прыляцець вам проста ў рукі. Цяпер важна не спалохацца раптоўнага поспеху і не пачаць мітусіцца з радасці. Панядзелак варта прысвяціць вырашэнню сямейных праблем, удзяліце ўвагу дзецям. У сярэдзіне тыдня вас чакае фінансавы поспех. Старайцеся пазбягаць перагрузак на працы, залішняя занятасць не толькі не пакіне часу, каб радавацца жыццю, але пагражае негатыўна адбіцца на здароўі.

**СТРАЛЕЦ*. На гэтым тыдні варта звярнуць увагу на сваё акружэнне, на ўзаемаадносіны з партнёрамі, сябрамі, сваякамі. Хутчэй за ўсё, у вас не атрымаецца ўдзяляць дастаткова часу справам праз занятасць сваімі асабістымі праблемамі. Ёсць небяспека пераацаніць свае сілы. Паспрабуйце не бегаць ад адказнасці. Вам ніхто не прапаноўвае вырашаць усе пытанні ў адзіночку. Патрабуецца толькі адно: не звальваць на іншых тое, што будзе ўскладзена на вас.

**КАЗЯРОГ*. Тыдзень можа прынесці пазітыўныя тэндэнцыі ў многіх справах. Аднак свае планы і намеры неабходна захаваць у таямніцы, калі вы зацікаўлены ў іх ажыццяўленні. У аўторак магчыма з'яўленне заступніка або ўплывовай асобы, якая будзе да вас добразычлівая, тады пачнецца новы віток у вашай кар'еры. У суботу паспрабуйце выбрацца куды-небудзь у госці ці запрасіце да сябе каго-небудзь, і прыемныя зносіны вам забяспечаны.

**ВАДАЛІЎ*. На гэтым тыдні паспрабуйце не гнацца за нечым большым, інакш вы рызыкуеце страціць тое, што ўжо маеце. Трэба максімальна засяродзіцца на тым, чым займаецеся ў дадзены момант. Лепш рабіць адну справу, але добра. У аўторак не спяшайцеся з нейкімі рашэннямі, бо геніяльная на першы погляд ідэя можа не дажыць да практычнага ўвасаблення. У выхадныя паспрабуйце суаднесці свае жаданні з жаданнямі блізкіх людзей і выбраць шлях, які задаволіць усіх.

**РЫБЫ*. Гэты перыяд можа аказацца поўным выпадковасцяў, напрыклад вас могуць раптам адправіць у адпачынак або ў камандзіроўку. Затое зможаце завесці каштоўныя знаёмствы, гэтаму будуць спрыяць ваш дар красамоўства і ўменне пераконваць навакольных. На працы давядзецца разлічваць толькі на свае сілы і магчымасці. Надзейнасць партнёраў пагражае аказацца вельмі ўмоўнай. Старайцеся быць мякчэйшымі з хатнімі, пры неабходнасці дапамагайце ім.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	9.08	17.36	8.28
Віцебск —	9.03	17.20	8.17
Магілёў —	8.58	17.26	8.28
Гомель —	8.48	17.29	8.41
Гродна —	9.22	17.53	8.31
Брэст —	9.17	17.59	8.42

Месяц

Поўня 21 студзеня.
Месяц у сузор'і Шаляў.

Імяніны

Пр. *Пятра, Савы, Таццяны.*
К. *Генрыха, Ірэны, Мілаша, Паўла, Таццяны, Эльвіры, Яна.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЗАЎТРА



Даты | Падзеі | Людзі

25 СТУДЗЕНЯ

У краіне

1804 год — нарадзіўся (в. Гейстуны Ашмянскага павета) Антон Эдвард Адынец, публіцыст, паэт, перакладчык, мемуарыст, выдавец. У 1823 годзе скончыў Віленскі ўніверсітэт. У Вільні пазнаёміўся з А. Міцкевічам, Я. Чачотам, Я. Ходзькам. З'яўляўся членам таварыства філарэтаў. У 1841—1859 гадах — рэдактар газеты «Виленский вестник». Падарожнічаў па Заходняй Еўропе. Аўтар мемуарных «Пісем з падарожжа», «Успамінаў з мінулага», у якіх ёсць звесткі пра гістарычныя падзеі ў Беларусі. Памёр у 1885 годзе.

1869 год — нарадзіўся (былы фальварак Кавалькі, цяпер у Мядзельскім раёне) Адам Гурыновіч, беларускі паэт-дэмакрат, фалькларыст, перакладчык. У 1887 годзе скончыў Віленскае рэальнае вучылішча, дзе цікавіўся беларускім фальклорам, пытаннямі грамадскага жыцця. Затым вучыўся ў Пецярбургскім тэхналагічным інстытуце. Быў членам, а пазней кіраўніком нелегальнага «Гуртка моладзі польска-літоўскай, беларускай і маларасійскай». Пісаў на беларускай, польскай і рускай мовах. У паэтычных творах быў паслядоўнікам Ф. Багушэвіча. Звяртаўся да жанраў балады, байкі, пейзажнай лірыкі. Пераклаў на беларускую мову асобныя творы А. Пушкіна, І. Крылова, М. Някрасава і іншых аўтараў. Памёр у 1894 годзе.

1955 год — нарадзіўся (вёска Кузьмічы Дзятлаўскага раёна) Аляксандр Іванавіч Лакотка, беларускі архітэктар, доктар гістарычных навук, доктар архітэктуры, прафесар, акадэмік НАН Беларусі. Працаваў у Беларускім дзяржаўным музеі народнай архітэктуры і побыту, з 1995-га — у Інстытуце мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы НАН Беларусі (з 2004 г. — дырэктар). Аўтар больш як 200 навуковых прац у галіне тэорыі і гісторыі архітэктуры, аховы і рэстаўрацыі архітэктурнай спадчыны. Стварыў навуковую канцэпцыю гістарычнага феномена беларускай архітэктуры як выніку сінтэзу будаўнічага мастацтва Усходу і Захаду Еўропы. Выявіў вялікую колькасць помнікаў народнага дойлідства, што паслужыла асновай для стварэння з яго удзелам музея народнай архітэктуры пад адкрытым небам. Аўтар праектаў рэстаўрацыі шэрагу аб'ектаў гісторыка-архітэктурнай спадчыны.

У свеце

1759 год — нарадзіўся Роберт Бёрнс, знакаміты шатландскі паэт, фалькларыст, аўтар шматлікіх вершаў і паэм, напісаных на так званай раўнінай шатландскай і англійскай мовах. Дзень нараджэння Роберта Бёрнса, 25 студзеня, — нацыянальнае свята ў Шатландыі, якое адзначаецца ўрачыстым абедам з традыцыйным парадкам падавання апетых паэтам страў (асноўнае — сытны пудынг хагіс). Памёр у 1796 годзе, у дзень, калі з'явілася на свет яго пятае дзіця.

1874 год — нарадзіўся Уільям Сомерсет Моэм (1874—1965), англійскі пісьменнік, драматург. Аўтар раманаў «Месяц і грош», «Тэатр» і інш.

1924 год — у горадзе Шамані (Францыя) адкрыліся першыя ў гісторыі зімовыя Алімпійскія гульні. Удзельнічалі прадстаўнікі 16 краін (293 спартсмены, у тым ліку 13 жанчын), якія змагаліся ў дзевяці відах спорту і разыгралі 16 камплектаў узнагарод. Самым тытулаваным спартсменам гэтых гульняў стаў фінскі канькабежац Клас Тунберг, які заваяваў чатыры медалі, у тым ліку тры залатыя. У неафіцыйным камандным заліку верх атрымала каманда Нарвегіі, якая заваявала ўвогуле 17 медалёў, з якіх 5 залатых, 7 сярэбраных і 6 бронзавых. Першая зімовая Алімпіяда працягвалася да 4 лютага.



УСМІХНЕМСЯ

Пельмені — гэта не толькі смачная, карысная і здаровая ежа, але і адзін з атрыбутаў мужчынскай незалежнасці ад жаночага ярма!

Адэскі двор.

— Сямён Маркавіч, я чую, ваша Роза грае на флейце, хоць раней заўсёды грала на раялі?

— Такі так, ледзь пераканаў!

— А розніца?

— Граючы на раялі, яна ж такі мела магчымасць яшчэ і падпяваць сабе!

Пасля таго як вучань выкарыстаў на ўроку лаянку, настаўнік працы выгнаў яго са словамі: «Ідзі, я навучыў цябе ўсяму, што ведаю».

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: В. АНУФРЫЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ тэл./факс: 287 17 79,
РЭКЛАМЫ e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 146.

Нумар падпісаны ў 19.30 24 студзеня 2019 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12